**СЛАЎНЫМІ СПРАВАМІ АЗНАМЯНУЕМ 70-ГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА!**

# НА РОСКВІТ РАДЗІМЫ СВАЁЙ АДДАДЗІМ

*Адрасы студэнцкага лета*

## У ВОБЛАСЦІ І ЗА ЯЕ МЕЖАМІ

Сёлета на філалагічным і гістарычным факультэтах сфарміравана 15 атрадаў, два з якіх — будаўнічага напрамку. Як і ў мінулым годзе, будзе працаваць навукова-вытворчы атрад «Археолаг» з ліку студэнтаў першага і другога курсаў гістарычнага факультэта. Яго байцы прымуць удзел у раскопках гарадзішча ў парку культуры і адпачынку імя Луначарскага (камандзір — студэнтка гр. Г-21 А. Пічугіна). Пяць атрадаў сфарміравана для работы ў піянерскіх лагерах вобласці. СА «Дружба-88» (камандзір Д. Паўлавец) паедзе ў горад-пабрацім Чэске-Будзеёвіце. Там нашы студэнты будуць заняты будаўнічымі работамі.

Большая частка атрадаў нашага факультэта падрыхтоўчы перыяд завяршыла паспяхова. Прыкладам могуць служыць СА «Аэліта» (камандзір — студэнтка гр. БР-13 Г. Бандарэнка, «Журавінка» (камандзір Л. Глушэц з гр. БР-11). Гэтыя атрады выязджаюць у калгас «Усход» Лоеўскага раёна на ўборку гародніны і фруктаў. Разам са студэнтамі будуць працаваць тры вучні з СШ № 16 г. Гомеля. Усе байцы здалі экзамены па ТБ, своечасова прайшлі медагляд.

Нядрэнна падрыхтаваліся да працоўнага семестра-88 атрады «Маладосць» (камандзір Ю. Тумiловiч, гр. БР-13), «Альтаір» (камандзір Н. Маслоўская, гр. БР-23). Байцы СА «Надзея» і «Купалінка» (камандзіры Н. Салаўёва, гр. БР-21 і Т. Саўчык, гр. БР-24) паедуць працаваць у Стаўрапольскі край. У мінулым жа годзе яны добра зарэкамендавалі сябе ў час работы на Хойніцкім кансервавым заводзе.

Нельга не сказаць і пра тыя атрады, якія рыхтаваліся да працоўнага лета без належнай адказнасці. На жаль, былі і такія. Аднак, думаецца, у той час, які яшчэ крыху застаўся да выезду, яны змогуць выправіць усе недахопы.

Ёсць у нас нямала студэнтаў, якія паедуць у саставе студэнцкіх атрадаў ужо ў чацвёрты і трэці разы. Сярод іх чацвёртакурснік Сяргей Герашчанка, камандзір атрада «Сузор'е» Наталля Ямеленка, камісар гэтага ж атрада Ірына Каралёва і многія іншыя.

На працоўны семестр-88 байцамі атрадаў філалагічнага і гістарычнага факультэтаў запланавана таксама правядзенне грамадска-палітычнай, ваенна-патрыятычнай работы. Ёсць упэўненасць, што і сёлета нашы атрады паспяхова справяцца з усімі прынятымі абавязацельствамі і вернуцца восенню ва універсітэт з пачуццём выкананага абавязку.

**В. ДАМАСКАНАЎ,**
**сакратар камітэта ЛКСМБ філалагічнага і гістарычнага факультэтаў.**



— Якім ён будзе, першы ў студэнцкім жыцці працоўны семестр? Ці змагу я, камандзір атрада, зрабіць усё так, каб прайшоў ён паспяхова і яго байцам-дзяўчатам хацелася зноў кожнае лета збірацца ў дарогу!

Прыкладна такія думкі цяпер усе больш настойліва ўзнікаюць у першакурсніцы філалагічнага факультэта Галіны Бандарэнка, камандзіра сельскагаспадарчага атрада «Аэліта».

Юрый Тумiловiч, аднакурснік Галіны, ужо добра ведае, што такое будатрад, бо едзе ў яго ў другі раз. Сёлета — ён камандзір СБА «Маладосць».

На здымку: Галіна Бандарэнка і Юрый Тумiловiч.
Фота А. Ульянкінай.

## «ЭКАНАМІСТ» ЕДЗЕ Ў СІБІР

Два гады назад наш атрад «Эканаміст» рыхтаваўся да працоўнага семестра-86 з асаблівым пачуццем: па заключанаму дагавору нам прадстаяла работа па пракладцы дарогі на Саматлор. Гэта быў наш першы такі далёкі ад розных беларускіх мясцін будаўнічы аб'ект. Уяўлялі сустрэчу з велічнай сібірскай ракой Об, касцёр на яе беразе, песні пад гітару... Але жыццё ўнесла свае карэктывы — здарылася чарнобыльская аварыя і той працоўны семестр нам давялося правесці на Гомельшчыне. Тут так спатрэбіліся тады маладыя працавітыя рукі, каб як мага хутчэй узвесці новае жыллё для людзей, якіх чарнобыльская бяда прымусіла пакінуць свае родныя хаты. Мы будавалі дамы для перасяленцаў у саўгасе «Вялікаборскі» Хойніцкага раёна.

Чаму нагадаў менавіта лета-86? Мабыць таму, што ў такіх экстрэмальных умовах правяраюцца маральныя якасці кожнага чалавека, высвятляецца, ці існуе ў студэнцкім атрадзе сапраўдны калектыў. Тая праверка паказала, што ён у нас ёсць. Інакш не застаўся б састаў нашага атрада амаль нязменным вось ужо чацвёртае працоўнае лета.

І цяпер наша мара папрацаваць у далёкай Сібіры збываецца. Хутка мы адправімся ў Цюменскую вобласць, каб унесці і свой пасільны ўклад у асваенне багатага сібірскага краю. У 185 км ад Ніжневартаўска, паблізу пасёлка Радужны наш «Эканаміст» будзе выконваць работы па бетанаванню пляцовак пад буравыя нафтавыя вышкі. Па заключанаму дагавору нам неабходна асвоіць 100 тысяч рублёў капіталаўкладанняў.

Там, дзе ёсць дружны калектыў, справы заўсёды ідуць паспяхова. У тым, што ён у нас ёсць, заслуга і кіраўніцтва нашага атрада — камандзіра Сяргея Цімохіна, камісара Валерыя Ігнатава. Яны карыстаюцца аўтарытэтам, павагай у байцоў, за імі заўсёды пойдуць усе рабяты.

У нас ёсць гарачае жаданне працаваць у далёкай Сібіры так, каб пакінуць пасля сябе добрую памяць, заслужыць шчырую ўдзячнасць нафтавікоў. 21 черв. 1988

**Г. МАТОРАНКА,**
**баец атрада «Эканаміст».**

# ПАКАЗЧЫКІ

### ВЫКАНАННЯ ЎМОЎ РЭСПУБЛІКАНСКАГА, АБЛАСНОГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ЗА ПАВЕЛІЧЭННЕ ЎКЛАДУ КАЛЕКТЫВАЎ СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ У ВЫКАНАННЕ ЗАДАННЯЎ 1988 ГОДА

| Назва асноўных паказчыкаў | Адзінка вымярэння |
|---|---|
| 1. Прыцягненне ў студэнцкія атрады<br>— студэнтаў ВНУ<br>— навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў | % ад колькасці студэнтаў навучальнай установы |
| 2. Выкананне плана фарміравання выязных атрадаў:<br>— СБА<br>— атрады небудаўнічага напрамку | % да плана |
| 3. Вытворчая дзейнасць: | |
| 3.1. Выпрацоўка сярэднедзённая на аднаго члена СБА | рублёў |
| 3.2. Сярэднедзённая заработная плата СБА | рублёў |
| 4. Сярэднедзённая заработная плата аднаго байца атрада небудаўнічага напрамку (без уліку медыцынскіх, педагагічных СА) | рублёў |
| Сярэднедзённая заработная плата праваднікоў, гандлёвых атрадаў вызначаецца з улікам папраўчнага каэфіцыента па формуле:<br>Папраўчны каэфіцыент = | Сярэднедзённая зарплата небудаўнічых атрадаў па вобласці / Сярэднедзённая зарплата СА (гандлёвыя або праваднікі) |
| 5. Прыцягненне ў атрады педагагічна запушчаных падлеткаў | колькасць падлеткаў / колькасць вузаўскага кантынгенту СА |
| 6. Пералічэнне ўдзельнікамі СА сродкаў у грамадска-карысныя фонды | агульная сума пералічэнняў / сярэднеспісачная колькасць абласнога (зводнага) СА |

Заўвага: 1. Паказчыкі 3, 4, 5 вызначаюцца шляхам сумы месцаў па адпаведных паказчыках работы атрадаў на тэрыторыі вобласці фарміравання, узяных і выяздных СА.

2. Агульная сума пералічэнняў у паказчыку 6 вызначаецца з улікам пералічэнняў сродкаў, зробленых за Дні бязвыплатнай працы, на імя Ганаровага байца, атрадамі бязвыплатнай працы і іншых пералічэнняў.

3. Пры падвядзенні вынікаў будуць улічвацца ініцыятывы, новыя формы грамадска-палітычнай работы СА.

*Камандзірам і камісарам СБА*

## ДЛЯ ПАДПІСАННЯ ВЫЯЗНОГА ПАШПАРТА

З мэтай праверкі гатоўнасці студэнцкіх атрадаў да выканання вытворчай, грамадска-палітычнай работы ў працоўным семестры-88 абласны штаб СБА праводзіць падпісанне выязных пашпартоў. Яго будуць ажыццяўляць камісар, галоўны інжынер, галоўны ўрач, інструктар і намеснік камандзіра абласнога штаба СБА 24 чэрвеня ў 15 гадзін у камітэце камсамола ГДУ.

Усім камандзірам і камісарам атрадаў універсітэта неабходна прадставіць наступную дакументацыю і атрадную сімволіку:

— Куток Ганаровага байца
— Пашпарт атрада
— Інфармацыю аб падлетках, якія стаяць на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх і залічаных у студэнцкія атрады.
— План работы атрада
— Тэксты лекцый і рэцэнзіі сцэнарыяў выступленняў агітбрыгады
— Тры павязкі для дзяжурных па ТБ
— Куток ТБ
— Талоны па ТБ
— Санпашпарт лагера
— Журнал медпадрыхтоўкі атрада
— Ленінскае заданне на рабочы і інфармацыю аб выкананні за падрыхтоўчы перыяд.

Кіраўнікам СБА неабходна ведаць таксама нарматыўна-прававыя дакументы па арганізацыі дзейнасці СБА.

**КАМІТЭТ ЛКСМБ ГДУ,**
**АБЛАСНЫ ШТАБ СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ.**

## МОВАЙ ЛІЧБАЎ

⊙ У гэтым годзе ва універсітэце сфарміравана 44 студэнцкія атрады. З іх: 27 — небудаўнічага напрамку, — 17 — будаўнічага.

⊙ Усяго ў III працоўным семестры 1988 года прымуць удзел 1100 студэнтаў ГДУ.

— 4 студэнцкія атрады выязджаюць у Стаўрапольскі край.

⊙ Будаўнічы атрад эканамічнага факультэта выязджае ў Цюменскую вобласць.

⊙ У піянерскіх лагерах Гомельскай вобласці будуць працаваць 9 педагагічных атрадаў.

⊙ У саставе зводнага студэнцкага атрада ГДУ — 7 навукова-вытворчых атрадаў.

